У сувязі з ростам колькасці студэнтаў, наша каманда пашыраецца, і мы знаходзімся ў пошуку новых калег. Шукаем актыўных, камунікабельных супрацоўнікаў, гатовых спраўляцца з цікавымі задачамі ў дынамічным асяроддзі. Вас чакае файная каманда, офіс у старым горадзе, разнастайныя праекты, магчымасці для развіцця і адукацыі ў міжнародным універсітэце, знаёмства з сучаснымі тэндэнцыямі і падыходамі да адукацыі.

**Каардынатар Цэнтра кар'еры і па рабоце з выпускнікамі:**

Поўны працоўны дзень.

Абавязкі:

Праца з партнёрамі, арганізацыя кар'ерных мерапрыемстваў і стажыровак;

арганізацыя адукацыйных мерапрыемстваў у межах Цэнтра кар'еры;

кансультацыі студэнтаў па пытаннях, звязаных з дзейнасцю Цэнтра кар'еры;

камунікацыя з выпускнікамі і падтрымка супольнасці выпускнікоў, збор даных і іх абнаўленне, правядзенне штогадовых апытанняў сярод выпускнікоў;

арганізацыя мерапрыемстваў для выпускнікоў ЕГУ

дапамога ў падрыхтоўцы і правядзенні агульнаўніверсітэцкіх мерапрыемстваў, такіх як цырымонія ўручэння дыпломаў, арыентацыйны тыдзень і інш.

Патрабаванні:

Вольнае валоданне рускай мовай, веданне беларускай мовы. Валоданне ангельскай не ніжэй за B1. Вітаецца досвед на адміністрацыйнай пасадзе, а таксама досвед працы ў сферы HR.

Свае CV дасылайце на jobs@ehu.lt да 12 лютага  2023 года.